Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 ЛІПЕНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 142 (28252)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Хто маляваў іконы? Бог ведае**

СТАР. 4

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



**Сеяць — трэба. Араць — не абавязкова**



**Журналісты — яны ж дальнабойшчыкі**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід ЗАЯЦ,**
**міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«Ураджай збожжа, які вырашчаны сёлета ў Беларусі, дазволіць у поўнай меры забяспечыць харчовую бяспеку краіны. Для гэтага неабходна сабраць не менш як 8,4 млн тон збожжа, з якіх 1,1 млн т складзе дзяржрэзерв, 6,7 млн т пойдуць на кармавыя мэты, 600 тыс. т — на насенне. Сумнення ў тым, што мы справімся з гэтай задачай, няма. Акрамя таго, будзе атрыманы пэўны аб'ём збожжа для экспартных паставак».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.07.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9897 | ▲ |
| Еўра | 2,1830 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0306 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0802 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Прэзідэнт падпісаў Кодэкс Беларусі аб культуры

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў прыняты Палатай прадстаўнікоў і ўхвалены Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры, паведаміла прэс-служба беларускага лідара.**

Кодэкс аб культуры распрацаваны ўпершыню і не мае аналагаў на постсавецкай прасторы. Ён грунтуецца на дзеючых цяпер нормах законаў «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь», «Аб творчых саюзах і творчых работніках», «Аб кінематаграфіі ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь», «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь».

Кодэксам прадугледжваецца стварэнне на базе існуючых прававых інстытутаў адзінага механізму рэгулявання адносін у сферы культуры і адначасова ўстараненне недахопаў прававога рэгулявання ў гэтай сферы, забяспечваецца скарачэнне прававых актаў па пытаннях культуры і іх упарадкаванне.

У мэтах захавання культурных каштоўнасцяў, развіцця арганізацый культуры і забеспячэння агульнадаступнасці культурных здабыткаў кодэкс вызначаючаю прававыя, арганізацыйныя, эканамічныя і сацыяльныя асновы культурнай дзейнасці і рэгулюючца праваадносіны ў наступных сферах: захаванне і развіццё культурных каштоўнасцяў, ахова гісторыка-культурнай і археалагічнай спадчыны; бібліятэчная і музейная справа; кінематаграфічная дзейнасць; народныя мастацкія рамёствы, дзейнасць калектываў мастацкай самадзейнасці; правядзенне культурных мерапрыемстваў, арганізацыя культурнага адпачынку насельніцтва; узнагароды ў сферы культуры.

Кодэкс уступіць у сілу праз шэсць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.



# СЫШЛІСЯ ЭПОХІ ПАД ВЕЖАЙ



**740 гадоў споўнілася ў гэтым годзе Камянцу. 23 ліпеня з гэтай нагоды адбылося свята — Дзень горада.**

■ На свае вочы

# КОЛЬКІ КАШТУЕ «ДРОБЯЗЬ»?

## Спытайце ў эксперта!

**Упраўленне Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Мінску пачало сваю работу тры гады таму. Яно аб'яднала экспертныя службы іншых ведамстваў, у тым ліку МУС і МНС і цяпер усе даследаванні праводзяцца цэнтралізавана. Як жа працуюць судовыя эксперты? Наколькі іх праца падобная на тую, якую мы бачым у шматлікіх кінастужках? Каб развеяць многія міфы, для журналістаў была зладжана спецыяльная экскурсія па розных экспертных службах упраўлення.**

— Зараз цэнтральны апарат камітэта абмяркоўвае пытанне правядзення мастацтвазнаўчых экспертыз, — гаворыць **начальнік упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Мінску Мікалай ТАЛЕЦКІ.** — Але якое рашэнне будзе прынята, сказаць пакуль цяжка. Усё-такі кожны від экспертызы цягне за сабой пэўныя матэрыяльныя выдаткі. І таксама рабочыя: цяпер мы праводзім за год 35-39 тысяч экспертыз. Адметна, што іх становіцца болей, у тым ліку да нас звяртаюцца і ў прыватным парадку. Атрыманае аўтарытэтнае заключэнне эксперта становіцца сур'ёзным доказам у грамадзянскім працэсе.

Кошт адной гадзіны работы эксперта пасля дэнамінацыі складае 13 рублёў 32 капейкі. Прычым экспертыза можа доўжыцца як 3 гадзіны, так і некалькі дзён — усё залежыць ад складанасці даследуемага аб'екта.

У нас сабрана багатая зброевая калекцыя, — гаворыць **галоўны эксперт аддзела крыміналістычных экспертыз упраўлення крыміналістычных экспертыз Міхаіл СОБАЛЬ.** — Рэвальверы, аўтаматы, паляўнічыя стрэльбы трапляюць да нас рознымі шляхамі — канфіскуюцца з месца злачынства, здаюцца ўладальнікамі зброі ў падраздзяленні МУС.

Спецыялісты праводзяць балістычныя экспертызы, пры дапамозе якіх высвятляюцца асаблівасці падчас расследавання крымінальных спраў. І канешне ж, даследуюць халодную зброю.

Самы стары экзэмпляр у калекцыі — гэта наган 1899 года. Між іншым, падобная антыкварная зброя дагэтуль выкарыстоўваецца злачынцамі. Хоць, здавалася б, ёй даўно месца ў музеі.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

СТАР. 3